1. Замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (паляванне, рыбацтва, пчалярства, збор ягад, грыбоў, захаванне жывёлы, ураджаю);

2. Замовы супраць хвароб;

3. Замовы, звязаныя з сямейнымі адносінамі і прыватным бытам (сюды адносяцца таксама прысушкі і адсушкі – любоўныя замовы);

4. Замовы, звязаныя з грамадскімі адносінамі і г.д.

5. Замовы каштоўныя тым, што ў іх знайшлі адлюстраванне асаблівасці гаспадарчага, грамадскага і духоўнага жыцця чалавека. Яны з’яўляюцца помнікамі мастацкага слова народа.

Прыказкі і прымаўкі. У афарыстычнай творчасці беларускага народа прыказкі і прымаўкі карыстаюцца найбольшай папулярнасцю. Яны ярка адлюстроўвалі багаты працоўны і жыццёвы вопыт народа, яго мудрасць, псіхалогію і светапогляд, маральна этнічныя і эстэтычныя ідэалы.

У некаторых з іх адбіліся язычніцкія ўяўленні пра сусвет, прыроду, чалавека, расліны, жывёл. Прыказкі вучаць любіць свой край, Радзіму, яе герояў і ненавідзець ворагаў. Трапна выказвае народ свае думкі пра шчасце, лёс і долю, дабро і зло.

## ВАЕННЫ ПЕРЫЯД У ГІСТОРЫІ ВІЦЕБСКА

УА “Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”
**Вярхоўская В.А., 1 к., 2 гр., МПФ**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – ст. выкл. Варанец В.І.

23 чэрвеня 1944 года пачалася аперацыя “Баграціён” – рашаючы этап бітвы за Беларусь. Перад наступленнем у адпаведнасці з планам Беларускага штаба партызанскага руху ў ноч на 20 чэрвеня ў тыле ворага на ўсіх чыгуначных магістралях загрымелі выбухі. Пачалася аперацыя “Рэйкавая вайна”.

На Віцебскім напрамку раніцай 23 чэрвеня перайшлі ў наступленне войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў. Гэта было нечаканым для нямецкага камандавання. Паспяхова дзейнічалі войскі 39-й і 5-й армій Беларускага фронту. На працягу 23 чэрвеня яны прарвалі абарону ворага на ўчастку шырынёй 50 км і паглыбіліся на 10-11 км з мэтай акружэння віцебскай групоўкі нямецка-фашысцкіх войск.

25 чэрвеня войскі 43-й арміі генерала А. П. Белабародава 1-га Прыбалтыйскага фронту і 39-й арміі генерала І. І. Люднікава 3-га Беларускага фронту злучыліся ў раёне в. Гняздзілавічы. Былі акружаны 5 пяхотных



Репозиторий ГрГМУ

дывізій 3-й танкавай арміі агульнай колькасцю 35 тысяч чалавек.

Пад націскам войск 43-й і 39-й армій, падтрыманых буйнымі сіламі авіяцыі і артылерыі, акружаная групоўка 27 чэрвеня была разбіта. Вораг страціў толькі палоннымі больш за 10 тысяч чалавек. У ліку палонных знаходзіўся камендант Віцебска і камандзір 53-га пяхотнага корпуса генерал пяхоты Ф. Гольвіцер, яго начальнік штаба палкоўнік Г. Шміт, камандзір 206-й пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнант А. Хітэр і інш.

26 чэрвеня 1944 г. штурмам Віцебск быў вызвалены ад фашысцкіх акупантаў. З гэтай нагоды вечарам Масква салютавала воінам 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў 20 артылерыйскімі залпамі з 224 гармат. 63-м злучэнням і часцям, якія і праявілі баявое майстэрства пры вызваленні горада, было прысвоена ганаровае найменне "Віцебскія".

Вызвалены Віцебск ляжаў у руінах. Горад быў разбураны больш чым на 90 працэнтаў. Чакала вялізная работа па яго аднаўленні.

Амаль 1100 дзён знаходзіўся Віцебск у цяжкай фашысцкай няволі. Акупанты апаганілі і разрабавалі горад над Дзвіной. Усё, што змаглі, адправілі ў Германію, астатняе зраўнялі з зямлёй. Вось як апісвае горад у газеце "Известия" яе карэспандэнт Я. Крыгер у нумары, які выйшаў 27 чэрвеня 1944 года: "Соборная площадь. Центр Витебска… Площадь изрыта воронками, вырванный из ячеек булыжник расшвырян по переулкам, по крышам, по пустынным дворам…

По уцелевшему мосту перебираемся в западную часть города. Вокзальная улица, излюбленное место гуляний в довоенные дни, - теперь мёртвая, дома стоят без крыш, с проломанными стенами, обрушенными потолками. Немцы взорвали все здания. Вокзал. Он взорван. Здание с надписью на белорусском языке: "Паштамт". Взорван. Больницы. Клубы. Детские дома. Всё взорвано. Измученный, израненный, разрушенный город дымит последними очагами пожаров".

У Віцебску з кожнай сотні жылых дамоў цэлымі засталіся толькі тры, а пасля выгнання акупантаў 26 чэрвня 1944 года ў горадзе налічвалася 118 жыхароў. Да вайны Віцебск быў буйным індустрыяльным цэнтрам Беларусі. У 1938 г. ў горадзе выпускалася 28 % прамысловай прадукцыі рэспублікі. На прадпрыемствах працавала 30 % рабочых ад усёй колькасці іх на Беларусі. Былі пабудаваны 15 прамысловых прадпрыемстваў. Узніклі новыя галіны прамысловасці: станкабудаўнічая, абутковая, трыкатажная, мэблевая. Развівалася тэкстыльная, швейная і харчовая прамысловасць. Павялічылася жыллёвае і камунальнае будаўніцтва. У 1940 годзе ў горадзе дзейнічалі 209 прадпрыемстваў.

У Вялікую Айчынную вайну акупаваны фашысцкімі захопнікамі горад быў амаль поўнасцю разбураны, загінула больш за 100 тысяч жыхароў, і, калі



Репозиторий ГрГМУ

ў чэрвені Віцебск быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, усе прадпрыемствы горада, чыгуначны вузел, аб'екты камунальнай гаспадаркі, бальніцы, музеі, школы, магазіны і жыллёвы фонд ляжалі ў руінах. Болем у сэрцы адгукнулася трагедыя Віцебска ў кожнага, хто бачыў яго летам 1944 года. Тады здавалася, што спатрэбяцца дзесяцігоддзі, каб узнавіць хаця б даваенны ўзровень развіцця гаспадаркі і культуры роднага горада. У першы год вызвалення ў горадзе былі створаны 800 аднаўленчых брыгад па 15-20 чалавек. Кожны працаздольны жыхар Віцебска адпрацоўваў на аднаўленчых работах не менш за 24 гадзіны. Зрабіць гэта было нялёгка, таму што 70% жыхароў Віцебска ў той час складалі жанчыны. Але змяніўшы аўтаматы на станкі, сякеры і пілі, былыя франтавікі, партызаны і падпольшчыкі дружна ўзяліся за аднаўленне горада.Іх было няшмат, але прылад працы не хапала. Прадукты выдаваліся па картках. Жылі ў падвалах, бункерах і бараках і працавалі без стамлення – за дваіх, за траіх. Выходзілі пасля работы на суботнікі і нядзельнікі. Працавалі з асаблівым пад'ёмам, будавалі хутка, будавалі добра. Кожная працоўная перамога з'яўлялася сапраўдным святам. Дзякуючы няспынным намаганням, наш горад падняўся з попелу, на яго праспектах зноў заселянелі сады. На месцы былых заводаў ствараліся новыя прадпрыемствы. За першыя 5 пасляваенных гадоў прамысловасць была адноўлена, а па многіх паказчыках значна пераўзышла даваенны ўзровень.

## ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА ЛІДЫ

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
**Жалеская А.В., 1 к., 2 гр., МПФ**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – ст. выкл. Варанец В.І.

Ліда – асаблівы горад. Ёсць у ім асаблівы шарм, які незаўважна зачароўвае і пакідае цёплыя ўспаміны. Размешчана Ліда на плоскай раўніне: ні аднаго пагорка, ні аднаго сур'ёзнага ўздыму.

Датай узнікнення Ліды лічаць 1323 год - пачатак узвядзення Лідскага замка, вакол якога паступова вырас горад. Ліда належала непасрэдна вялікім князям Гедзіміну, Кейстуту, Альгерду, Ягайле, Вітаўту; у 1396-99 у Лідзе жыў беглы татарскі хан Тахтамыш. З 1384 неаднаразова падвяргалася нападам крыжакоў. У 15-16 ст. горад быў значным цэнтрам рамяства і гандлю, звязаны з Вільняй, Навагрудкам, Менскам, Полацкам. У гэты час горад складаўся з рыначнай плошчы і 4 вуліц, да яго прымыкала прадмесце Зарэчча. Камера катаванняў у Лідскім замку была прадугледжана яшчэ



Репозиторий ГрГМУ